Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

11 ЖНІЎНЯ 2017 г. ПЯТНІЦА №153 (28517)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Індывідуальны дрэс-код для школьнікаў**
СТАР. 4




**Увага! Новыя тэлеконкурсы**
СТАР. 5



**Праграма тэлебачання на тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Віктар НАЗАРАНКА, старшыня Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі:**

*«Стандарты распрацоўваюцца для шырокага кола спажыўцоў. На асноўныя віды харчовай прадукцыі, уключаючы малочную і мясную, ужо распрацаваны і дзейнічаюць дзяржаўныя стандарты, выконваючы патрабаванні якіх, і зараз магчыма вырабляць прадукцыю без ГМА, з мінімальным утрыманнем солі і цукру. Усё залежыць ад таго, які чынам вытворца распрацуе рэцэптуру, падабраўшы сыравіну і яе суадносіны. Немалаважны таксама і попыт на такую прадукцыю на рынку з боку пакупнікоў, а гэта ўжо новая культура спажывання».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.08.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9516 | ▼ |
| Еўра | 2,2876 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0325 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0760 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# У ЖНІЎНІ — ЖАЦЬ

## Прэзідэнт ставіць задачу паскорыць тэмпы ўборачнай на 10—15%

**Учора ў Івацэвічах было каля трыццаці градусаў вышэй за нуль па Цэльсію, сонечна. Ідэальны дзень для хлебароба. Праўда, прайшоў невялікі дожджык... Але тут ужо выбіраць не прыходзіцца. Калі прыходзіць час — хлеб павінен быць сабраны. Інакш будуць праблемы і з кормам для жывёл, і з коштам хлеба ў крамах.**

Кіраўнік дзяржавы з рабочай паездкай наведвае Брэсцкую вобласць. Учора ён пабываў у Івацэвіцкім раёне. Першым пунктам праграмы стала поле адкрытага акцыянернага таварыства «Квасевічы».

### 10 МІЛЬЁНАЎ ТОН — РЭАЛЬНАСЦЬ

Трэба сказаць, што жніво на Брэстчыне ідзе добрымі тэмпамі. Па стане на ўчора ў рэгіёне ўбралі каля 78% збожжавых і зернебабовых культур — Брэсцкая вобласць упэўнена трымае лідарства па ўборцы ўраджаю. Як далажылі Аляксандру Лукашэнку, сёлета плануецца сабраць ураджай збожжавых — без кукурузы — у памеры восем мільёнаў тон. З кукурузай і рапсам павінны сабраць каля 10 мільёнаў тон.
СТАР. 2


Фота БЕЛТА.



# Поле Корсакаў

Дынастыя хлебаробаў Корсакаў, што працуе ў агракамбінаце "Зара" Магілёўскага раёна, добра вядомая і на Магілёўшчыне, і ў краіне. Уладзімір КОРСАК неаднойчы быў сярод пераможцаў «Дажынак». Сёлета разам з сынам Вадзімам камбайнер зноў пацвярджае статус лідара жніва — іх сямейны экіпаж першы ў вобласці (разам з экіпажам Уладзіміра МЕЛЬНІКАВА і Аляксея МАКОСАВА з той жа гаспадаркі) сабраў 2 тысячы тон збожжа.

Фота БЕЛТА.

■ Жыллё мае

# КАПРАМОНТ ЗА МЕСЯЦ

**Такі эксперымент, што мае на мэце палепшыць якасць капітальнага рамонту і выявіць рэзервы для скарачэння затрат на работы, пачнецца восенню на спецыяльна адабраных пілотных аб'ектах сталіцы і іншых рэгіёнаў краіны. Пра гэта расказалі прадстаўнікі Міністэрства ЖКГ і Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі.**

Пры гэтым у месячны тэрмін капрамонту не ўваходзіць падрыхтоўчыя работы.

— Каб выконваць капрамонт за месяц, трэба праводзіць вялікую падрыхтоўчую працу са спажыўцом, размаўляць з ім і даносіць да яе ўсю інфармацыю: пра склад работ, графік атрымання доступу ў кватэру і іншае. Каб не было потым пытанняў з праектнай дакументацыяй і не з'явіліся схаваныя дадатковыя работы, якія не былі выяўлены раней, — акцэнтаваў увагу **Андрэй РАМАШКА, начальнік упраўлення жыллёвай гаспадаркі Міністэрства ЖКГ.** — Калі ўсё гэта будзе зроблена, то не ўзнікне ніякай складанасці з тым, каб увайсці ў дом і выканаць працу за месяц.

Каб дасягнуць разумення з жыхарамі і выканаць графік работ, магчыма, дзесьці будуць арганізаваны і дадатковыя змены будаўнікоў, каб было зручна ўсім, мяркуе спецыяліст.

— Капітальны рамонт за месяц прадугледжвае выкананне асобных відаў работ у кватэры (замена газавых камунікацый, сістэм водазабеспячэння і каналізацыі), а не капрамонт усяго дома, — падкрэсліла **Валянціна ЧЫГІР, начальнік аддзела ДА «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка».** — Напрыклад, адрамантаваць тыя ж балконы за месяц немагчыма.

Увогуле, заканадаўча цяпер прадугледжана, што на капрамонт дома патрабуецца 3,5—5 месяцаў. На падставе вынікаў эксперыменту нарматыўныя тэрміны правядзення капрамонту будуць перагледжаны.
СТАР. 3

# У ЖНІЎНІ — ЖАЦЬ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

У асноўным усе вобласці (за выключэннем Віцебшчыны) выйдуць, як і даручаў кіраўнік дзяржавы, да 20 жніўня на завяршальную стадыю. На поўначы сёлета складаная ўборка.

— Нам трэба перастаць слухаць супакойванні кіраўнікоў, губернатара Віцебшчыны, — заявіў Прэзідэнт. — Калі мы бачым, што там добры хлеб, яго трэба збіраць. Трэба перакідаць туды тэхніку. Узнікне праблема з сушылкамі. Таму я ўжо сказаў, што мы забіраем зерне, вязём на элеватар, перапрацоўваем яго... Хлеб з палёў трэба ўбраць.

Сапраўды, выбару тут асаблівага няма: або мы прыбіраем хлеб так, або зерне напросту згніе.

— Я ўжо адчуваю, што ва ўборку ўсе ўцягнуліся, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка і дадаў: — Ужо нікога папракаць не трэба, але неабходна на 10—15% дадаць хуткасці. Трэба хутчэй.

## ПАЛІВА І ЭКСПЕРЫМЕНТЫ

Падчас размовы з прадстаўнікамі ўрада, кіраўніцтвам вобласці, раёна кіраўнік дзяржавы закрануў і яшчэ адно праблемнае для сельскай гаспадаркі пытанне — кантроль над расходам паліва:

— Мы пра гэта не кажам, але ў Беларусі бяда. У нас у механізатараў у асобных гаспадарках зарплата мізер, але з трактара не прагнаць. Пракантралявалі: зліваюць салярку, прадаюць. Кіраўнікі не кантралююць. І на крадзяжы ён можа зарабіць дзесяць сваіх зарплат. У нас ёсць гэта праблема.

Кіраўніку дзяржавы паведамілі, што найбольш эфектыўнае рашэнне — датчыкі расходу паліва. Ён жа паабяцаў пракантраляваць, як сітуацыя будзе вырашацца.

Сельская гаспадарка ў нейкім сэнсе — творчасць. Парада Прэзідэнта гаспадарнікам — эксперыментаваць:

— Трэба эксперыментаваць: пазней, раней пасеялі, менш, больш — гэта твая ўжо справа. І тады можна паглядзець — што будзеш мець.

У той жа час застаецца традыцыйны падыход: у вёсцы на прадпрыемстве многае — калі не ўсё, як слушна заўважыў кіраўнік краіны, — залежыць ад людзей. Калі чалавек ставіцца да тэхнікі па-чалавечы, то яна працуе эфектыўней і яе хапае на больш доўгі тэрмін. Кіраўнік дзяржавы паглядзеў, як убірае збожжа камбайн вытворчасці «Гомсельмаш». Машына сапраўды працавала добра і якасна, хоць і не была новай. Вось і адказ: калі клапаціцца пра тэхніку, будзе лепшым і ўраджай, і яго якасць. Ды і грошы для гаспадаркі зэканомяцца.

## АДКАЗНАСЦЬ СТАРШЫНІ

І падчас селектарнай нарады, што адбылася на мінулым тыдні, і літаральна днямі, падчас новых прызначэнняў, Прэзідэнт папярэдзіў: у першую чаргу ён будзе цікавіцца праблемнымі гаспадаркамі. Таму старшыні райвыканкамаў галоўную ўвагу павінны надаваць менавіта ім. Вось і падчас учарашняй паездкі ў Івацэвіцкі раён Аляксандр Лукашэнка спытаў:

— Тут у вас у раёне якія гаспадаркі праблемныя? Тры, чатыры, пяць, колькі іх?

У Івацэвіцкім раёне такіх тры. Паступова яны падцягваюцца да годнага ўзроўню.

— Гэта тыя гаспадаркі, у якіх ты практычна жывеш? — пацікавіўся Прэзідэнт у старшыні Івацэвіцкага райвыканкама Аляксандра Грыцука. — Мы дамаўляліся, што старшыня райвыканкама павінен перш за ўсё з усімі кіраўнікамі ўзяць гэтыя гаспадаркі на кантроль.

Прэзідэнт пацікавіўся: «У якую з трох складаных гаспадарак накіруемся?» Дарэчы, праграмай паездкі гэта не прадугледжвалася. У выніку спыніліся на адкрытым акцыянерным таварыстве «Косава». Але пра гэта трошкі пазней.

## МАЛАКО ЯК ГАРАНТЫЯ ДАБРАБЫТУ

Далей Аляксандр Лукашэнка паглядзеў малочнатаварную ферму «Квасевічы», дзе была праведзена рэканструкцыя. Прэзідэнт падкрэсліў: будаўніцтва і рэканструкцыя падобных прадпрыемстваў маюць для дзяржавы, яе эканомікі асаблівае значэнне.

— Вы ўжо паспяхова забылі пра тое, што я ад вас патрабаваў: пабудаваць 1200 малочнатаварных ферм«— кроў з носа, — нагадаў кіраўнік краіны. — Трэба выканаць гэтую задачу як мага хутчэй.

«За паўтара года гэтыя пытанні неабходна зняць, — акрэсліў тэрмін Прэзідэнт. — Будаваць трэба дазволідь любымі метадамі. Хоча гаспадарчым спосабам — трэба дазволіць, гэта танней значна. Галоўнае — якасць».

— Але ў нас ёсць другая праблема, — дадаў Аляксандр Лукашэнка. — Мы зараз пабудуем фермы — не пытанне. Павінна быць і высокаўдойная скаціна.

Увогуле, падобныя фермы — будаўніцтва, рэканструкцыя якіх пачалася адносна нядаўна, — цяпер адны з самых прыбытковых сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. Некалькі гадоў таму, калі работа ў гэтым кірунку толькі пачыналася, апазіцыя крытыкавала такую палітыку. Але крытыка аказалася неканструктыўнай:

— Не было б таго рашэння — сёння не засталося б сельскай гаспадаркі. Дык вы хоць грошы маеце. А хто мае добрае малако — наогул добра жыве.

## АД ПРАБЛЕМЫ ДА ІДЭАЛУ

«Косава» — адна са складаных гаспадарак Івацэвіцкага раёна. Менавіта яе вырашыў учора — незапланавана — наведаць кіраўнік краіны. На полі прадпрыемства ён сустрэў экіпаж камбайна — Мікалая і Ірыну Харужых, якія працуюць разам ужо не першы год. У мінулым годзе яны былі сярод тысячнікаў, плануюць дасягнуць гэтай планкі і сёлета. Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся, як працуецца, і падарыў Ірыне Харужай букет.

Наступны прыпынак — малочнатаварная ферма «Старажоўшчына», што ўваходзіць у склад ААТ «Косава». Прадпрыемства зараз знаходзіцца на так званым этапе аздараўлення. Гэта значыць у пастаўлены тэрмін яно павінна выйсці на ўзровень добрых гаспадарак раёна. Кіраўнік дзяржавы паставіў задачу прывесці ферму ў парадак да лістапада і паабяцаў, што зноў наведае яе ў азначаным месяцы. Ураду было даручана выдзеліць ферме 200 тысяч рублёў — каб з праблемнай яна ператварылася ў ідэальную.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*
*Івацэвіцкі раён.*

## АДЧУЦЬ ДАПАМОГУ

**Як і раней, па суботах на сувязі з насельніцтвам — Мінскі гарадскі і абласныя выканаўчыя камітэты. Час працы застаецца нязменным — звярнуцца з просьбай або прапанаваць наўпрост да прадстаўніка ўлады можна з 9 гадзін раніцы і да поўдня. Прамыя тэлефонныя лініі ў краіне сталі рэгулярнымі ў пачатку 2015 года. З таго часу магчымасцю вырашыць праблемныя пытанні аператыўна і без залішняй папяровай цяганіны скарысталіся многія беларусы.**

**12 жніўня на званкі будуць адказваць:**

- старшыня БРЭСЦКАГА абласнога Савета дэпутатаў Сяргей Дзмітрыевіч АШМЯНЦАЎ. Тэл. 8 (016) 2213121;
- старшыня ВІЦЕБСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Уладзіміравіч ЦЯРЭНЦЬЕЎ. Тэл. 8 (021) 2222222;
- намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ПРЫВАЛАЎ. Тэл. 8 (023) 2751237;
- першы намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Іван Алейзавіч ЖУК. Тэл. 8 (015) 2735644;
- намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Віктар Уладзіміравіч НЕКРАШЭВІЧ. Тэл. 8 (022) 2501869;
- намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Сяргей Пятровіч НЕЎМЯРЖЫЦКІ. Тэл. 8 (017) 5004160;
- старшыня МІНСКАГА гарадскога Савета дэпутатаў Васіль Васілевіч ПАНАСЮК. Тэл. 8 (017) 2224444.


**Извещение о проведении открытого аукциона на право заключения договора аренды земельного участка**

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 42-61-62.

| Предмет аукциона, кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка, срок аренды, размер начальной цены и задатка. |
|---|
| Лот №1. Право заключения договора аренды сроком на 10 лет земельного участка с кадастровым №240100000003009897 площадью 0,1537 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Чкалова для строительства объекта «Автомойка в Медцентре возле разворотного кольца в городе Витебске» (размещение объектов по ремонту и обслуживанию автомобилей (в том числе автомобильных заправочных и газонаполнительных станций)). Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранные зоны электрических сетей напряжением до 1000 В, сетей и сооружений водоснабжения. **Нач. цена**: 8 185,30 руб. **Задаток:** 818,53 руб. |
| **Дата, время и место проведения аукциона**: 14.09.2017 в 12.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** с 11.08.2017 с 8.30 по 13.09.2017 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в рабочие дни с 8.30 до 17.30 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY14AKBB36423020002802000000 в ф-ле №200 Витебское обл. управление ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21200, УНП 300200386, получатель платежа: Витебский горисполком. **Условия аукциона:** возместить в установленном порядке убытки, причиняемые ДКУСХТП «Зеленхоз» в связи со сносом многолетних насаждений в сумме 760,87 руб., заключить с Витебским горисполкомом договор аренды зем. участка; получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительство объекта в срок, не превышающий 3 месяца, с момента гос. регистрации права на зем. участок; при необходимости привлечь инженерную организацию (инженера) для оказания инженерных услуг в строительстве в порядке и на условиях, предусмотренных законодательством и договором на оказание инженерных услуг, выполнить работы по подготовке проектной документации при условии заключения в установленном порядке договора подряда на проведение проектных и изыскательских работ, в срок до одного года со дня государственной регистрации права на зем. участок; разработать ПСД в соответствии с действующими ТНПА, согласовать ПСД с главным архитектором города Витебска, при необходимости провести гос. экспертизу ПСД |

Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462. Для участия в аукционе приглашаются граждане, индивидуальные предприниматели, юр. лица, консолидированные участники (двое и более граждан, индивидуальных предпринимателей, юр. лиц). Граждане, индивидуальные предприниматели, консолидированные участники и юр. лица (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный срок подают заявление на участие в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, с отметкой банка, заключают соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения; индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя; представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная юр. лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих гос. регистрацию юр.лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юр. лица; представителем иностранного юр. лица – легализованные копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык, легализованные доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о фин. состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем иностранного гражданина – легализованная доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; консолидированными участниками представляются оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов предъявляется документ, удостоверяющий личность. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона, обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за предмет аукциона и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; в течение двух месяцев со дня подписания договора аренды земельного участка, но не позднее трех месяцев со дня утверждения протокола о результатах аукциона в установленном порядке обратиться за государственной регистрацией права на земельный участок в РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру». Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. Конт. тел.: (0212)42-61-62, (029)510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.


■ Заканадаўства

# Дзейнічаць аператыўна:

### паведамляць аб замежніках, якія засяліліся, трэба будзе не пазней чым праз тры гадзіны

**Зараз падаваць гэтую інфармацыю неабходна на працягу сутак. Аднак з 1 кастрычніка дзейнічаць прыйдзецца хутчэй.**

Гэта звязана з уступленнем у сілу змен, унесеных Законам Рэспублікі Беларусь ад 20 ліпеня 2016 года «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях вымушанай міграцыі». Новаўвядзенне датычыцца гасцініц, санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацый, суб'ектаў аграэкатурызму, а таксама юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія аказваюць паслугі па здачы ўнаём і паднаём жылых памяшканняў.

Падаваць звесткі аб замежніках, якія часова знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі, неабходна ў аддзел унутраных спраў. З 1 кастрычніка зрабіць гэта можна будзе пры дапамозе аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы «Гасцініцы», адзінага партала электронных паслуг агульнадзяржаўнай аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы і шляхам дастаўкі нарачным. У цяперашні час гэтая інфармацыя перадаецца па каналах электроннай сувязі або нарачным.

Варта памятаць, што, калі патрэбныя звесткі не паведамлены праваахоўнікам ва ўстаноўлены тэрміны або інфармацыя заведама няпраўдзівая, у адпаведнасці з арт. 23.16 КоАП гэта цягне папярэджанне або накладанне штрафу ў памеры ад 4 да 20 базавых велічынь.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

■

**ПРАМАЯ ЛІНІЯ:**

Задаць пытанні, якія датычацца новаўвядзенняў, можна сёння, 11 жніўня, з **10.00 да 11.00** па тэлефоне **(8 017) 218-55-30.** На прамой тэлефоннай лініі будзе намеснік начальніка дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі **Віталь Мікалаевіч НАВУМЧЫК,** а таксама прадстаўнікі Нацыянальнага цэнтра электронных паслуг — начальнік аддзела арганізацыі і прасоўвання паслуг Алена Фёдараўна СТРЫЖКО і вядучы спецыяліст таго ж аддзела Дзмітрый Уладзіміравіч ЗАЛЕСКІ.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ



### Каля АЭС «Фукусіма» знайшлі снарад

Яго адшукалі ўсяго за 300 метраў ад тэрыторыі аварыйнай АЭС «Фукусіма-1» на паўночным усходзе Японіі. Супрацоўнікі будаўнічай кампаніі, якая ўдзельнічае ў пашырэнні паркоўкі ў раёне станцыі, знайшлі падазрона цыліндрычны аб'ект даўжыняй 85 сантыметраў і прыкладна 15 сантыметраў у дыяметры. Раён у радыусе 200 метраў ад падазронага прадмета ачэплены, аднак работа аварыйнай АЭС «Фукусіма-1» вядзецца ў звычайным рэжыме, адзначылі прадстаўнікі кампаніі — аператара станцыі ТЕРСО. Як вядома, падчас Другой сусветнай вайны ў гэтым рэгіёне размяшчаўся аэрадром паветраных сіл Імператарскай арміі Японіі.

### Расіі прадракаюць буйную хвалю эміграцыі

У амерыканскай аналітычнай кампаніі Stratfor лічаць, што Расію хутка накрые «самая буйная за апошнія 20 гадоў хваля эміграцыі» Па даных Stratfor, усё больш расіян задумваюцца аб пераездзе ў іншую краіну. Сёння з'язджаюць высокакваліфікаваныя спецыялісты, якія не бачаць для сябе перспектыў у Расійскай Федэрацыі. Як адзначаюць эксперты, «уцечка мазгоў» будзе прычыняць шкоду расійскай эканоміцы яшчэ доўгія гады. Па даных Stratfor, палова расійскай моладзі маральна гатовая пакінуць межы краіны.

### Mercedes-Benz распрацавала падушкі бяспекі для пешаходаў

Кампанія Mercedes-Benz, якая ўваходзіць у канцэрн Daimler, атрымала патэнт на знешнія падушкі бяспекі, якія павінны максімальна абараніць пешахода ў выпадку ДТЗ. Падушкі будуць усталёўвацца ў стойкі лабавога шкла і спрацоўваць па сігнале спецыяльных датчыкаў у той момант, калі сутыкненне чалавека з аўтамабілем становіцца непазбежным. Пра ноу-хау нямецкага аўтапрама паведамляе выданне Motor1. У Mercedes-Benz падкрэсліваюць важнасць вынаходкі для зніжэння рызыкі цяжкіх наступстваў ДТЗ, калі чалавека на вялікай хуткасці збівае аўтамабіль. У такой сітуацыі знешнія падушкі бяспекі могуць выратаваць жыццё пешахода, упэўнены ў кампаніі.

### У Індыі чакаюць падзенне вытворчасці кавы



Гэта адбудзецца з-за працяглага перыяду сухога надвор'я. У наступным сельскагаспадарчым годзе, які пачнецца 1 кастрычніка, выпуск кавы можа скараціцца да прыкладна 300 тыс. тон. Гэта будзе самы нізкі аб'ём з 2009—2010 гадоў, калі ўраджай складаў 289,6 тыс. тон. Індыя пастаўляе на экспарт 70% кавы, выробленай у краіне, і памяншэнне ўраджаю можа негатыўна адбіцца на экспарце. Зніжэнне аб'ёмаў вытворчасці чакаецца і ў Бразіліі, дзе ўраджай таксама пацярпеў ад засухі. Цэны на «арабіку» падскочылі прыкладна на 24% з чэрвеня, калі на біржы ў Нью-Ёрку быў зафіксаваны мінімум за 15 месяцаў. А «рабуста» падаражэла на 16%.

■ Жніво-2017

# СТРАТЭГІЧНЫ РАПС

## Азімая культура скошана, яравая — на чарзе

**У сельскагаспадарчым вытворчым кааператыве «Прагрэс-Верцялішкі» (Гродзенскі раён) уражаем алейнай культуры задаволены — сёлета атрымана 53,4 ц/га. Гэта ў 2,3 раза вышэй за сярэднерэспубліканскі паказчык. Гаспадарка поўнасцю забяспечыць птушку і буйную рагатую жывёлу ўласным бялковым кормам.**



Аляксандр ГАРОШКА на рапсавым полі.

На рапсавым полі ідзе завяршальны этап — пагрузка і вываз цюкоў саломы. Дбайныя гаспадары вывозяць усё падчыстую. І гэта не проста адходы, якія ідуць на подсціл для жывёлы. Здробленую салому рапсу дадаюць у корм. Такую ідэю вытворцам падказалі навукоўцы Гродзенскага аграрнага ўніверсітэта. Яны ўпэнены, што гэты кампанент корму выклікае добры апетыт у жывёл — «казыча рубец», як вобразна зазначыў **намеснік старшыні кааператыва Аляксандр ГАРОШКА.**

...Здаецца, што нам не прабіцца праз тоўстыя сцёблы, што тырчаць на полі. Але аўтамабіль Аляксандра Іванавіча ўпэўнена рухаецца па рапсавай пожні да той самай тэхнікі, якая вывозіць з поля цюкі. Камбайны, што хадзілі тут нядаўна, ужо змянілі жняяркі і вядуць уборку на суседнім, ячменным участку. Але праз тыдзень-другі зноў вернуцца да гэтай культуры. Азімы рапс у зернявай групе пачынае ўборачную кампанію, а яравы — завяршае.



Гэтай культуры апошнім часам тут надаюць асаблівае значэнне. Яна з кожным годам набірае папулярнасць. Вось і сёлета плошчу пад рапс павялічылі, і цяпер яна займае чвэрць усёй зерневай групы гаспадаркі. Вышэй леташняга атрымалі і ўраджайнасць. Плошчы пад азімы рапс таксама плануюць павялічыць.

Такая ўвага да алейнай культуры апраўданая. За ёй стаіць эканамічны разлік. Аляксандр Гарошка прыводзіць такія аргументы: калі раней на закупку бялковых кампанентаў для кармоў трацілі 1,6 млн долараў, то цяпер — толькі 800 тысяч. Эканомію забяспечвае рапс.

Згодна з прагнозам яго будзе сабрана каля 3 тыс. тон. Гэтага дастаткова, каб поўнасцю забяспечыць бялковай сыравінай птушкагадоўлю і буйную рагатую жывёлу. Сёлета плануюць увесці рапсавы алей і ў рацыён норак. Іх тут каля 40 тысяч.

...З поля едзем на міні-завод па перапрацоўцы насення рапсу. Яго засыпаюць у бункер, ачышчаюць, падсушваюць, а затым адпраўляюць пад прэс. Гатовы алей выцякае праз краннік, а макуху складзіруюць у спецыяльныя ёмістасці. Яна — важны кампанент камбікармоў. Абсталяванне не таннае — 200 тыс. долараў. Але ўкладзеныя сродкі вярнуліся з прыбыткам, кажа Аляксандр Гарошка. У будучым у гаспадарцы маюць намер прадаваць лішкі алею. Сёлета ўстаноўку павялічылі яшчэ на адзін прэс.

— Цяпер мы поўнасцю перайшлі на ўласную сыравіну, — кажа Аляксандр Гарошка, — гэта вельмі перспектыўна, таму мы хочам максімальна павялічыць плошчы пад азімы рапс. Зносім пустыя хутары, задзейнічаем землевыя ўчасткі.

Пакуль на адным канцы поля жнуць, на другім — ужо сеюць. Тэхнікі ў гаспадарцы дастаткова — на лініі працуе 14 камбайнаў, у палявых работах задзейнічана больш за 100 чалавек.

**На 10 жніўня ў калгасе скошана палова плошчы. Ураджайнасць збожжавых складае 98,8 ц/га.**

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** *margo@zviazda.by*

**У тэму:**

**Алена ЧАРНУШЧЫК, намеснік старшыні СВК «Прагрэс-Верцялішкі»:**

— У гаспадарцы распрацавана сістэма прэміравання падчас уборачных работ. Калі намалот за дзень склаў 70—100 тон (у залежнасці ад тыпу камбайна), камбайнеру за гэты дзень налічваецца дадаткова 15 рублёў да зарплаты. Гэта датычыць і вадзіцеляў. Таксама па выніках уборкі прадугледжана прэмія. За першае месца камбайнер і вадзіцель атрымаюць 250 рублёў, за другое — 220, за трэцяе — 190 рублёў. Зарплата на перыяд уборкі павялічана на 25%. Напрыклад, на ўборцы рапсу зарплата склала 1,5 тыс. рублёў.

Каб чарговая ўборка запомнілася, падрыхтаваны іменныя прызы ў выглядзе стэлы з арганічнага шкла з лагатыпам. Таксама пераможцам уручаюцца белы хлеб і букет з каласкамі. Будзем рабіць памятны фотакалаж пра лідараў жніва.

Мы стараемся прэміраваць як мага больш добрасумленных работнікаў, нават тых, хто не трапіў у лік прызёраў, але намалаціў і перавёз больш за 1,5 тыс. тон збожжа.

Калгасныя «Дажынкі» мяркуем правесці ў канцы жніўня.

# КАПРАМОНТ ЗА МЕСЯЦ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Капітальнага рамонту патрабуе каля 10% жылля краіны, кажуць спецыялісты.

— У 90-я гады аб'ёмы капрамонту былі надта нізкія. Ды і ў 2010-м, напрыклад, выконваўся рамонт толькі 1% аб'ёму ўсёй эксплуатаванай плошчы жылля. Сёлета мы выходзім на 2,3% — гэта запланаваныя 2,6 млн м² для капітальнага рамонту па ўсёй краіне. Згодна ж з дзяржаўнай праграмай «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе» аб'ёмы капрамонту да 2020 г. павінны дасягнуць 3% у год. Гэта аптымальны штогадовы паказчык, які дазволіць у далейшым не павялічваць так званую зону недарамонту, — расказаў Андрэй Рамашка.

Дастойным паказчыкам дасягненняў апошняга дзесяцігоддзя быў названы ўзровень старога і аварыйнага жылля, які ў краіне не падымаецца вышэй за 0,1%. Добры знак таксама — штогадовае нарошчванне аб'ёмаў капрамонту.

— У 2015-м было адрамантавана 670 тыс. м², сёлета мы збіраемся зрабіць 794 тыс. м². А ўвогуле, Мінск гатовы штогод рамантаваць да мільёна квадратных метраў пры наяўнасці сродкаў, — паведаміла Валянціна Чыгір. — Што датычыцца добраўпарадкавання дваравых тэрыторый, то мы робім у Мінску падходы да жылых дамоў, падходы да пад'езда. Для арганізацыі безбар'ернага асяроддзя ў некаторых месяцах робім з'езды, усталёўваем поручні. Віды работ у параўнанні з тымі, што выконваліся ў папярэдня гады, крыху скараціліся.

За кошт адлічэнняў грамадзян па-ранейшаму аплачваецца да 30% сумы кошту капрамонту. З бюджэту сёлета на капітальны рамонт выдзелена 224 млн рублёў, а ўсяго патрэбна 300 млн.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

■ Занятасць

# АФІЦЫЙНАЕ БЕСПРАЦОЎЕ ЗА ЛІПЕНЬ ЗНІЗІЛАСЯ

**На пачатак жніўня ўзровень зарэгістраванага беспрацоўя ў краіне склаў 0,7 працэнта. Гэта на 0,1 працэнтнага пункта менш, чым было месяц таму.**

Доля незанятых грамадзян зменшылася ў некаторых абласцях: у Брэсцкай і Віцебскай — да 0,9 працэнта, у Гомельскай і Магілёўскай — да 0,8 працэнта (у параўнанні з ліпенем паказчыкі знізіліся на 0,1 працэнтнага пункта). А вось у астатніх рэгіёнах без змен. На Гродзеншчыне ўзровень афіцыйнага беспрацоўя складае 0,8 працэнта, на Міншчыне — 0,7 працэнта, у сталіцы — 0,4 працэнта.

У Мінпрацы і сацабароны тлумачаць, што гэта традыцыйная для лета сітуацыя. Вакансій становіцца больш (за кошт часовых і сезонных работ), а саіскальнікаў менш (хтосьці вырашае на гэты час адпачыць, заняцца гаспадаркай на ўласным участку). Такая тэндэнцыя захоўваецца і ў верасні. Колькасць зваротаў у службы занятасці пачынае расці з кастрычніка. У тым ліку і таму, што работу шукае моладзь, якая не паступіла ў каледжы і ўніверсітэты.

За ліпень колькасць вакансій вырасла амаль на тысячу. Цяпер у базе — каля 55 тысяч прапаноў. З іх палова — з заробкам менш за 400 рублёў. 38 працэнтаў вакансій мае заработную плату ў 400—600 рублёў, яшчэ 12 працэнтаў — працоўныя месцы, дзе абяцаюць больш за 700 рублёў у месяц (з іх толькі 2,7 працэнта — з заробкам у тысячу рублёў).

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

■

# АБ ДАПАМОЗЕ ШМАТДЗЕТНЫМ СЕМ'ЯМ ДА НОВАГА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА

**Штогод напярэдадні новага навучальнага года сем'ям, якія выхоўваюць траіх і больш дзяцей, даецца аднаразовая матэрыяльная дапамога да навучальнага года. У Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны паведамілі, якую падтрымку атрымаюць шматдзетныя сем'і сёлета.**

Спецыялісты міністэрства заявілі, што выплата матэрыяльнай дапамогі прадугледжана на кожнага навучэнца, які навучаецца ва ўстановах агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі, у памеры да 30% бюджэту пражытковага мінімуму, дзеючага на 1 жніўня 2017 году (да 59,27 руб.).

У 2017 годзе такую дапамогу плануецца аказаць 63,6 тыс. сем'яў на 154,7 тыс. дзяцей.

У міністэрстве таксама адзначылі, што малазабяспечаным сем'ям дапамога на падрыхтоўку дзяцей да школы аказваецца ў рамках дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі (у выглядзе аднаразовай або штомесячнай сацыяльных дапамог).

Па пытаннях прадастаўлення аднаразовай матэрыяльнай дапамогі да навучальнага года, а таксама аказання дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі неабходна звяртацца ў мясцовыя выканкам.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

■ Ну і ну!

# Дзеля выпіўкі абакраў маці

**У Першамайскі РУУС сталіцы паступіла заява аб крадзяжы мікрахвалевай печы і набору каструль у грамадзянкі. У ходзе аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў супрацоўнікамі аддзела крымінальнага вышуку было ўстаноўлена, што злачынства здзейсніў сын заяўніцы.**

Не знайшоўшы грошай для таго каб набыць спіртное, 28-гадовы беспрацоўны мінчанін вырашыў прадаць мікрахвалевую печ, якая належала яго маці. На гэтым зламыснік выручыў 60 рублёў. Пры продажы тавару пакупнікі пацікавіліся, ці не прадае мужчына яшчэ што-небудзь. Пры гэтым удакладніўшы — цікавяць каструлі. Нядоўга думаючы, малады чалавек узяў з дому такі набор, які прадаў тым жа людзям за 25 рублёў. Усе выручаныя грошы хлопец у выніку выдаткаваў на спіртное. Па артыкуле за крадзеж яму пагражае пазбаўленне волі на тэрмін да чатырох гадоў. Раней малады чалавек ужо неаднаразова прыцягваўся да крымінальнай адказнасці.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■


**РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Полесьеэлектромаш»**

| № Лота | Краткая характеристика Объекта | Начальная цена с учетом НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот №1 | Токарно-винторезный станок 16К20, инв. №12615. Г. в. – 1978. Масса – 3225 кг. Габариты – 3195x1198x1500. | 3 066,00 | 306,60 |
| Лот №2 | Токарно-винторезный станок 16К20, инв. №12560. Г. в. – 1976. Масса – 3005 кг. Габариты – 2795x1198x1500. | 1 810,80 | 181,08 |
| Лот №3 | Токарно-винторезный станок 16К20, инв. №12701. Г. в. – 1984. Масса – 3005 кг. Габариты – 2795x1198x1500. | 3 982,80 | 398,28 |
| Лот №4 | Токарно-винторезный станок 16К20, инв. №12508. Г. в. – 1976. Масса – 3005 кг. Габариты – 2795x1198x1500. | 2 172,00 | 217,20 |
| Лот №5 | Токарно-винторезный станок 16К20, инв. №12544. Г. в. – 1976. Масса – 3005 кг. Габариты – 2795x1198x1500. | 2 172,00 | 217,20 |
| Лот №6 | Токарно-винторезный станок 16Е20, инв. №12726. Г. в. – 1976. Масса – 2000 кг. Габариты – 2400x1220x1640. | 2 172,00 | 217,20 |
| Лот №7 | Токарно-винторезный станок МК6056, инв. №12789. Г. в. – 1993. Масса – 3100 кг. Габариты – 2800x1265x1485. | 7 071,60 | 707,16 |
| Лот №8 | П/автомат кругло-шлифовальный 3Е183В, инв. №17718. Г. в. – 1990. Масса – 4438 кг. Габариты – 2940x2150x2120. | 25 411,20 | 2 541,12 |

**Местонахождение лотов**: Брестская обл., г. Лунинец, ул. Красная, 179. **Шаг аукциона** – 5%.

**УСЛОВИЯ**

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект (Объекты) по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), – Претендент на покупку должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) в течение 5 (пяти) календарных дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен оплатить стоимость приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) в течение 10 (десяти) календарных дней после подписания договора купли-продажи.
3. Демонтаж и вывоз Объекта (Объектов) за счет Победителя аукциона (Претендента на покупку).
4. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
5. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством и настоящим договором для Победителя аукциона.

**Аукцион состоится 20.09.2017 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
**Продавец:** ОАО «Полесьеэлектромаш» 225644, Брестская обл., г. Лунинец, ул. Красная, 179, т. 8 (01647) 2-43-30, ф. 8 (01647) 2-41-66.
**Организатор аукциона**: РУП «Институт недвижимости и оценки» 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, т. 8 (017) 306-00-57
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Полесьеэлектромаш», проводимом 20 сентября 2017 г.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. **Окончание приема заявлений:** 15.09.2017 в 11.00.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами. Контактные лица для осмотра Объектов: главный инженер Карпцов Эдуард Николаевич, 8 (029) 107-98-00. Организатор аукциона или Продавец вправе снять Лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

**☎ Организатор электронных торгов: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

# У «ШКОЛУ БУДУЧЫНІ»... З ІНДЫВІДУАЛЬНЫМ СТЫЛЕМ

**Дзяржаўны стандарт адзення для навучэнцаў можа быць зацверджаны да канца бягучага года. Пра гэта на прэс-канферэнцыі паведаміў намеснік старшыні канцэрна «Беллегпрам» Аляксандр ЯКАЎЧЫЦ.**

— Работа над дзяржаўным стандартам ужо набліжаецца да завяршэння, — праінфармаваў ён. — Зараз стандарт праходзіць экспертызу. Мяркую, што да канца года ён будзе зацверджаны і мы будзем кіравацца ім пры вытворчасці адзення для школьнікаў.

Паводле яго слоў, галоўная мэта дзяржаўнага стандарту — ліквідаваць рознachтанні ў разуменні таго, што ж з'яўляецца адзеннем дзелавога стылю: «Дзіця можа лічыць, што гэта адзенне дзелавога стылю, а ва ўстанове адукацыі думаюць па-іншаму. Таму ўсе нормы, пачынаючы ад тэхналогій вытворчасці і заканчваючы ўпакоўкай, будуць прапісаны ў гэтым стандарце. І ўсе будуць дакладна разумець, што канкрэтны выраб па нормах вытворчасці і складзе тканіны адносіцца да адзення дзелавога стылю і яго можна насіць у школу».

Аляксандр Якаўчыц падкрэсліў, што адзенне дзелавога стылю выпрабляецца з двух відаў тканін — паўшарсцяных і полівіскозных. Калі раней школьная форма «калолася», то цяпер, дзякуючы ўжыванню новай тэхналогіі вытворчасці, паўшарсцяныя тканіны пазбаўлены гэтай адмоўнай уласцівасці. Што датычыцца полівіскозных тканін, то дабаўленне віскозы ў склад тканіны даходзіць да 35—40%. «Віскоза — штучны заменнік баваўнянага валакна, які пры захаванні ўсіх спажывецкіх уласцівасцяў бавоўны дазваляе зменшыць цану на гэты від тканіны. Таму мы цяпер актыўна працуем над фарміраваннем лінейкі адзення для школьнікаў з выкарыстаннем віскозы», — дадаў намеснік старшыні канцэрна.

Асобна Аляксандр Якаўчыц спыніўся на праекце «Школа будучыні»:

— Па заказе ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі мы прапануем калекцыі адзення для ўніфікацыі дзелавога стылю ў той ці іншай школе або гімназіі. Пачыналі з дзесяці школ, праект развіваўся паступова. А ў гэтым годзе апранулі ў рамках праекта ўжо 27 тысяч навучэнцаў са 112 устаноў адукацыі. Практыка паказала, што гэта досыць цікавая ідэя. Таму мы з Міністэрствам адукацыі падумаем, як перафарматаваць праект, каб зрабіць яго больш эфектыўным. Маем намер і ў далейшым падтрымліваць гэтую ідэю, спрыяць таму, каб стыль і імідж установы адукацыі падкрэсліваліся аднолькавым стылем адзення іх вучняў.

Між іншым, **галоўны спецыяліст упраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі Ірына БУЛАЎКІНА** запэўніла, што школы ўдзельнічаюць у праекце толькі па жаданні навучэнцаў і са згоды бацькоў. Рашэнне прымаецца Саветам установы адукацыі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■ Надвор'е

# Градус паветра расце. Чакаецца да +35

## А вада працягвае праграvaцца

**Спякота да 35 градусаў чакаецца ў Беларусі ў выхадныя дні, паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды. У дзённы час на большай частцы тэрыторыі краіны тэмпература паветра дасягне 30—34 градусаў цяпла, месцамі па Брэсцкай вобласці паветра прагрэецца да плюс 35.**


Фота БЕЛТА.

У пятніцу надвор'е ў Беларусі будуць вызначаць атмасферныя франты і вельмі цёплая паветраная маса трапічнага паходжання. Ноччу і раніцай у многіх раёнах, днём пераважна на поўначы краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, навальніцы. У некаторых раёнах пры навальніцах магчымы моцныя ліўні, шквалістае ўзмацненне ветру парывамі да 15—22 м/с. Тэмпература ночу складзе 15—21 градус вышэй за нуль, днём — 30—34 градусы, месцамі па Брэсцкай вобласці — плюс 35, па поўначы краіны будзе плюс 26—29.

Надвор'е ў суботу, 12 жніўня, абумовяць вельмі цёплыя паветраныя масы трапічнага паходжання. Ноччу будзе пераважна без ападкаў, днём у некаторых раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Ноччу і раніцай чакаецца слабы туман. Тэмпература ноччу складзе 16—21 градус вышэй за нуль. Днём — 28—34 градусы цяпла, месцамі па Брэсцкай вобласці — да плюс 35.

У нядзелю, 13 жніўня, спякота пачне паступова адыходзіць на ўсход. Надвор'е будзе вызначаць ужо халодны атмасферны фронт, які павольна перамяшчаецца з Заходняй Еўропы. Ноччу месцамі, днём у паўночна-заходніх і цэнтральных раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Тэмпература ноччу складзе 16—22 градусы вышэй за нуль. Днём — 26—33 градусы цяпла, па захадзе — плюс 19—25 градусаў.

Таксама ў Гідрамеце паведамілі, што тэмпература вады на Заходняй Дзвіне і Нёмане складае 20—22 градусы цяпла, Дняпры — плюс 21—23, Бярэзіне — плюс 19—22, Сожы — плюс 21—23, на Прыпяці — плюс 22—24, Заслаўскім вадасховішчы — плюс 20, Вілейскім вадасховішчы і возеры Нарач — плюс 21, у найбліжэйшыя дні вада працягне праграvaцца.

У панядзелак, 14 жніўня, захаваецца ўплыў франтальнага падзелу, днём на заходнія раёны пачне распаўсюджвацца зона павышанага атмасфернага ціску. Ноччу на большай частцы тэрыторыі, днём пераважна па ўсходняй частцы краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 10—17 градусаў вышэй за нуль, па ўсходзе — да плюс 19. Днём — 19—26 градусаў цяпла. У аўторак і сераду надвор'е будзе фарміраваць у асноўным зона павышанага атмасфернага ціску. Чакаецца цёплае камфортнае надвор'е. У аўторак будзе пераважна без ападкаў, толькі па паўднёвым усходзе пройдуць кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 8—15 градусаў вышэй за нуль, днём — плюс 20—26.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Будзьце пільныя!

# ДАСТУПНАЯ... АТРУТА

## Дзеці глытаюць капейкі, батарэйкі і бытавую хімію



**Медыкі загаварылі аб вывядзенні на новы, прававы, узровень праблемы адказнасці бацькоў, чые дзеці трапілі ў клініку з небяспечнымі рэчывамі ў стрававodze або страўніку.**

На жаль, не ўсё, што можа праглынуць чалавек, здольна пакінуць арганізм натуральным шляхам. Тая ж плоская батарэечка, хоць і малая, але агрэсіўна прапальвае страваvод і пашкоджвае аорту — гэта выклікае крывацёк, ад чаго дзіця можа загінуць ці застацца інвалідам. Але чаму бацькі кідаюць дзіця без нагляду? Чаму дробныя прадметы аказваюцца такімі даступнымі для малых? Што прымушае бацькоў пераліваць атрутныя вадкасці ў бутэлькі з-пад ліманаду? Пытанні носяць у першую чаргу сацыяльны, а не медыцынскі характар. Тым не менш Міністэрства аховы здароўя Беларусі звяртае ўвагу вытворцаў хіміі на неабходнасць выкарыстання спецыяльнай упакоўкі, якую не змогуць адкрыць дзеці, якая павінна мець невялікі аб'ём, быць няяркай і змяшчаць павялічаны шрыфт для папярэджвання аб смяротнай небяспецы. Адпаведным патрабаванням павінна адпавядаць і замежная прадукцыя.



— Фактычна ў любы дзень і час у нашай клініцы знаходзяцца каля 40 дзяцей з апёкам стрававода, — расказвае **дырэктар РНПЦ дзіцячай хірургіі Канстанцін ДРАЗДОЎСКІ.** — Іншародныя целы ў страўнікава-кішачным тракце дзяцей — плоскія батарэйкі, манеты, шрубы, шарыкі, якія глытаюцца, а таксама агрэсіўныя вадкасці, якія выпіваюцца дзецьмі, — застаюцца сур'ёзнай праблемай. Сёлета ў цэнтр трапіла 171 дзіця з іншародным целам. Галоўным чынам гэта пацыенты з Мінска. З рэгіёнаў дастаўляюцца радзей, бо там таксама ёсць магчымасці аказання меддапамогі ў падобных выпадках. Калі ў 2015 годзе мы выканалі 26 эндаскапічных аперацый па прычыне выдалення іншароднага цела са стрававода або страўніка, то ў 2016-м — 86, а сёлета — ужо 91. Па краіне за 7 месяцаў праведзена 137 такіх умяшанняў. Глытаюць дзеці і розныя агрэсіўныя вадкасці, самая страшная з якіх — сродак для чысткі каналізацыі кшталту «Крата». У 2016-м паступілі 38 дзяцей з апёкам стрававода, сёлета — ужо 67...

Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр дзіцячай хірургіі аказвае сёння меддапамогу на самым сучасным узроўні. Дзякуючы ініцыятыве дабрачыннага фонду «Шанс» клініка атрымала нядаўна абсталяванне на суму звыш 300 тысяч долараў. Як толькі яго ўстановяць, стане магчымым аказваць хірургічную дапамогу дзецям з парушэннямі рытму сэрца ва ўзросце 2—5 гадоў. Такія пацыенты змогуць пайсці ў школу ўжо здаровымі, займацца спортам. Тым часам кампанія Velcom сабрала ў межах сваёй дабрачыннай акцыі каля 90 тысяч рублёў для атрымання абсталявання па правядзенні хуткай, сучаснай працэдуры пункцыі сасудаў.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*





*Я жыву ў Дварцы*
*самым светлым*
*і самым прыгожым.*
*Яго столі — нябёсы,*
*блакітная вечная плынь.*
*На падлозе не мармур —*
*трава ў святаянавых росах*
*І стаяць каля ганкаў*
*дазоры пунсовых вяргінь.*

*Ты жывеш у Дварцы.*
*Ты адгэтуль ідзеш*
*кожны ранак*
*На сцяжыны пад шаты*
*бяроз і вячыстых дубоў.*
*І не гасне*
*ў вокнах святло*
*вышываных фіранак,*
*Каб у далі*
*далёкай дарогу*
*да хаты знайшоў.*

*Мы жывём у Дварцы*
*і ў часы,*
*калі сцюжа лютуе,*
*Не зайздросцім*
*чародам,*
*якія ў цёплых краях.*
*У гэтай вёсцы жывём*
*і ніколі аб тым*
*не шкадуем —*
*Гэта спадчына наша.*
*Гэта наша святая зямля.*




**Колькі на Беларусі Дварцоў? Я пытаюся не пра велічныя будынкі, якія пабудаваныя па праектах вядомых дойлідаў і ўражваюць ва ўсе часы сваёй вытанчанай дасканаласцю. Не. Я пытаюся пра вёскі, названыя ў свой час чамусьці так. Пакінем гісторыкам высвятляць паходжанне паселішчаў. Скажу адно: толькі на Міншчыне каля дваццаці вёсак маюць такую назву.**

**Мая думка наступная: з павагай ставіліся нашы дзяды да зямлі, якая была наканаваная ім лёсам. З паклонам падыходзілі да яе крыніц. З малітвай выходзілі на поле. І хіба ж гэта дзіва, што свой сціплы куточак на гэтай цудоўнай зямлі называлі яны шчыра і з павагай: Дварэц?**

**Паглядзіце на фотаздымкі, зробленыя ў вёсцы Дварэц на Любаншчыне. Углядзіцеся ў твары яе жыхароў. Пажадайце, каб і надалей ім шчасціла ў гэтым маляўнічым месцы з незвычайнай назвай.**



**На здымках вы бачыце Ніну КІСЕЛЬ (выдатная вышывальшчыца!), Аляксандра КІСЕЛЯ (удачлівы рыбак!), Анатоля БУБІЧА (гаспадара, які ўпрыгожыў падворак на радасць унукам і ўсёй вясковай дзятве).**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

# ТАЛЕНТ ТРЭБА ПАКАЗВАЦЬ

## Гэтай восенню беларусы могуць праявіць сябе ў некалькіх творчых тэлеконкурсах

**Тэлеканал АНТ сумесна са Спецыяльным фондам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, Міністэрствам культуры і Беларускай дзяржаўнай акадэміяй музыкі абвясціў прыём заявак у праект «Талент краіны». Улічваючы грамадскую значнасць і шырокую папулярнасць, гэты агульнарэспубліканскі дзіцячы тэлевізійны конкурс сёлета распачынае другі сезон.**

Як і раней, да ўдзелу ў ім запрашаюцца таленавітыя беларускія дзеці і падлеткі ва ўзросце ад 5 да 15 гадоў, незалежна ад рэгіёна пражывання, а таксама творчыя дзіцячыя калектывы (колькасцю не болей за тры чалавекі). Адбор будзе праходзіць па чатырох кірунках: вакальны жанр, харэаграфічнае майстэрства, інструментальнае майстэрства і арыгінальны жанр (у апошнюю катэгорыю ўключаны акцёрскае майстэрства, цыркавыя нумары і мастацкая дэкламацыя). Акрамя таго, зазначаюць стваральнікі «Таленту краіны», захаваецца і адмысловая «разынка» тэлепраекта — запрашаць у госці на кожную праграму таленавітых дзяцей з няпростымі жыццёвымі гісторыямі: выхаванцаў дзіцячых дамоў і інтэрнатаў, дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі. Пра кожнага з іх творчая каманда праекта падрыхтуе падрабязныя сюжэты, што дасць магчымасць прыцягнуць да іх увагу дабрачынных арганізацый, аказаць пэўную падтрымку на жыццёвым і творчым шляху.

Але ўсё гэта — у будучым часе. Пакуль жа тэлеканал гатовы прыняць першыя заяўкі (запоўніць анкеты ўдзельнікаў можна наўпрост на сайце www.ont.by ва ўкладцы «Праекты/Талент краіны-2») і рыхтуецца да адборачных тураў, якія пройдуць **2—5 верасня** з 10 да 18 гадзін у Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**



Першы сезон дзіцячага тэлеконкурсу атрымаўся хвалюючым і відовішчным.




Фота: прэс-служба АНТ.

«Вундэркінд джаза» з Салігорска, юная піяністка Сафія КУРЛОВІЧ стала пераможцай праекта «Талент краіны» ў малодшай узроставай групе. Першынство ў старэйшай узроставай групе атрымаў малады піяніст і кампазітар, мінчанін Мікіта ШАСТАКОЎ.

### Тым часам

Расійскі Першы канал скончыў кастынгі на шоу **«Голас-6»**, якое неўзабаве выйдзе ў эфір. Сярод кандыдатаў на ўдзел у вакальным конкурсе былі заўважаны і беларускія артысты — у тым ліку Руслан Аляхно. Навошта спявак, у творчым багажы якога ўжо ёсць перамогі ў тэлепраектах «Народны артыст» і «Адзін у адзін!», паездка на «Еўрабачанне» і ордэн «За ўнёсак у развіццё культуры Расіі», падаецца на чарговы конкурс? Уласна, з той жа мэтай, што і іншыя, не менш тытулаваныя артысты: ні творчага вопыту, ні тэлевізійных эфіраў, ні новых слухачоў зашмат не бывае. Ці дапамаглі былыя заслугі Руслану прайсці адбор і трапіць у лік 150 удзельнікаў «Голасу-6», даведаемся літаральна праз некалькі тыдняў.

Хутка падвядзе вынікі кастынгу і **«Фабрыка зорак»**, якая вяртаецца на тэлеэкраны праз 10 гадоў. Яна будзе выходзіць на канале «МУЗ-ТБ» пад кіраўніцтвам небезвядомага прадзюсара Віктара Дробыша і лагічнай назвай «Новая фабрыка зорак». Сярод кандыдатаў на ўдзел у гэтым праекце таксама адзначыліся нашы землякі — напрыклад, фіналістка леташняга нацыянальнага адбору на «Еўрабачанне» Аляксандра Ткач, а таксама яшчэ цэлы шэраг артыстаў-пачаткоўцаў.

■ Калейдаскоп

# Водпуск, як у кіно

**Да канца лета засталося ўсяго нічога, а вы яшчэ не былі ў водпуску? Прапануем вашай увазе 7 «летапісаў маленькага жыцця» — выдатных і лёгкіх фільмаў пра водпуск, якія дапамогуць зрабіць чаканне крыху менш доўгім і маркотным.**

**«Тры плюс два»** (СССР, 1963)

Трое маскоўскіх сяброў-халасцякоў адпачываюць дзікунамі ў палатцы каля мора. Тут ёсць пясчаны пляж, запас дроваў і пітной вады. Словам, амаль райскае месца. Было. Пакуль не прыехалі дзве незнаёмкі з заявамі, што гэта «іхняе старое месца», у доказ чаго нават выкапалі на пляжы бутэльку з пісьмом. Маладыя людзі мяняць дыслакацыю катэгарычна адмаўляюцца. Дзяўчаты таксама гатовыя паспрачацца за лепшае месца пад сонцам і разбіваюць сваю палатку побач, а далей... неабвешчаная вайна перарастае ў суцэльную рамантыку, якая і вымушае старэйшае пакаленне пераглядаць фільм па шмат разоў.

**«Разявака»** (Францыя, 1965)

Адна з бліскучых французскіх камедый з Луі дэ Фюнесам, якая нават праз 50 гадоў перадае каларыт сваёй эпохі і глядзіцца на адным дыханні.

...Камівяжор Антуан Маршаль і не здагадваецца, што яго прыемны спадарожнік, які прапанаваў бясплатную вандроўку на шыкоўным «кадылаку» з поўдня Італіі да Парыжа, — кіраўнік міжнароднай злачыннай групоўкі, а прычына шчодрасці ў тым, што літаральна кожная дэталь машыны нашпігаваная кантрабанднымі дыяментамі, золатам і наркотыкамі, на якія палюе бандыцкая хеўра. За ўсёй аперацыяй пільна сочыць паліцыя, і толькі галоўны герой даведваецца пра ўсё апошнім...

**«Будзьце маім мужам»** (СССР, 1981)

Настальгічна-камедыйная згадка пра мару ўсіх савецкіх людзей — адпачынак на поўдні Крыма, дзе кожнае лета насамрэч нагадвала адначасова мангола-татарскае нашэсце і стыхійны выгул селядцоў з бочкі.

Дзіцячы ўрач, які выпраўіўся ў водпуск да мора, атрымлівае нечаканую прапанову ад прывабнай незнаёмкі: сыграць ролю... яе мужа. Рэч у тым, што ёй, маці-адзіночцы, ніхто ў курортным горадзе не хоча здаваць жыллё, а вось калі на пастой просіцца сям'я — іншая рэч. Ну, а тое, што, акрамя маляўнічых краявідаў Сочы і шэрагу прыгод на свае галовы, героі ў рэшце рэшт знайшлі і сапраўднае сямейнае шчасце — прыемны бонус да летняга настрою фільма.

**«Маё вялікае грэчаскае лета»** (ЗША — Іспанія, 2009)

